**Праекты.** Фотавыстаўка «Чырванаборскі край» працуе ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Праект — вынік работы Чырванаборскай школы фатаграфіі ў турыстычным комплексе «Чырвоны Бор» з 21 да 30 жніўня 2022 года. У экспазіцыі прадстаўлены здымкі вядомых беларускіх фатографаў: аўтара ідэі фотаэкспедыцыі і куратара праекта Сяргея Плыткевіча, педагогаў Валерыя Вядрэнкі, Ірэны Гудзіеўскай, Віктара Малышчыца, Сяргея Мілюхіна і Наталлі Лакоткі, студэнтаў-пераможцаў Рэспубліканскага фотаконкурсу «Маладзёжны погляд» Ганны Беражковай, Івана Веразуба, Ганны Дамінікі Грыб, Марыі Зігаравай, Міхаіла Лук'янчыка, Валерыі Пратасевіч. У экспазіцыі прадстаўлены прыродныя ландшафты, лясныя экасістэмы, рэдкія расліны і жывёлы, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Выстаўка знаёміць гледачоў і з архітэктурнай спадчынай, якая захавалася на поўначы Верхнядзвінскага раёна: Успенская царква ў вёсцы Сар'я, руіны палаца Гільзенаў і Шадурскіх у Асвеі, рэшткі званіцы царквы Еўфрасінні Полацкай у Росіцы.